Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 16 Вільня, Серада 30 Красавіка 1930 г. Год VI (XIV).

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:	„Бел КРЫНІЦА“ каштуе на год—6 зл., на паўгода —	Цана абвестак:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)	3 зл., на 3 месяцы — 2 зл..	на 1-шай староны 60 гр., 2 і 3 — 50 гр., на 4-ай —
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. да 4 гадз. веч.	ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.	40 грш. – за радок дробнага друку ў аднэй шпальце

АДОЗВА

Беларускага павятовага выбарнага камітэту Ашмянскага павету сьпіску **№ 18.**

Беларусы Ашмянчукі!

Калі у 1928 годзе адбываліся выбары у Сойм, нашу восемнастку не дапусьцілі. Але Найвышэйшы Суд, разгледзіўшы нашу скаргу, тыя выбары ўняважніў і новыя выбары, такім чынам, адбудуцца 25 мая.

Закруціліся каля нашага мужыка розныя прахадзімцы-чужнікі. Закраталася «Стронніцтва Хлопске». Кажа яно, што будзе бараніць нашага селяніна. А ці праўда гэта? Каб на гэта адказаць, трэба глянуць, як польская партыя «Стронніцтво Хлопске» паскудзіла нашаму гаротнаму народу ў Сойме. Было гэта так: яшчэ ў гэтым годзе хацелі міністры правясьці закон, каб наслаць нам новую хмару чужнікоў-асаднікаў на нашыя землі. Тады гэтыя „польскія хлопы“ з № 10 з скуры вон лезьлі, каб такі закон прайшоў, гэта знача, каб нашу зямлю нам з пад носу забраць і аддаць розным прыблудам. Правадыром у гэтай шкодніцкай рабоце быў пасол Плюта з „Стронніцтва Хлопскага“ № 10.

Ня можна так-жа даваць свайго голасу і на іншыя польскія партыі, як „вызвалене“ №3, польскія Хадэкі **№ 25**, польскія соцыялісты № 2, бо ўсё гэта ваўкі ў авечных скурах. Што адносіцца да сацыялістаў (пэпээсаў) і камуністаў, то ясна кожнаму, што яны дамагаюцца скасаваньня ўласнасьці нават на маленькі кусочак зямлі. Гавораць яны найсаладзей, але ў жыцьці — іх праграма вядзе да торбы ўсіх людзей. Адным словам, мякка сьцеляць, але цьвёрда спаць. Аб польскіх хадэках з № 25 і гаварыць ня варта, бо на іх галасуюць адны паны і эндэцкія ксяндзы.

Ёсьць яшчэ апрача беларускай восемнасткі і іншыя партыі, што сябе называюць беларускімі. Гэта Янка Станкевіч, ведамы з даўнейшых выбараў. Панок гэты ў Сойме прападаў рука аб руку з польскай, казённай еднкай, галасаваў напрыклад, каб у буджэце даваліся грошы на польскія консуляты ў Афрыцы. А мужык беларускі за ўсё гэта плаціць! Адным словам Янка, пасварыўшыся з сваімі, пайшоў у польскія лякаі, бярэ ад паноў грошы на выбары і служа ім верна. Ведамы Янка і з таго, што сябе ён не пакрыўдзіў і пасьпеў ужо закупіць 600 дзесяцін зямлі. Як ведама, беларусы буржуазіі ня мелі. Цяпер ужо аднаго буржуя маем. Дык няхай-жа на яго галасуюць тыя, што маюць па 600 дзесяцін!

Ня можна так-жа ня браць пад увагу сьпіскі тых беларусаў, што ідуць за адно з комуністымі. Той, хто ведае, што ў Расеі робяць з сялянамі камуністы — той, ясна, што бальшавікоў будзе сьцерагчыся, як заразы.

Браты ашмянчукі! Ці-ж трэба нам пасьля сказанага гаварыць на які нумар аддаць свой голас?

Мы Вашы людзі ніжэйпадпісаныя, Вашы суседзі з аднаго павету кідаем, браты, кліч: Усе як адзін за восемнастку, бо там стаяць нашы людзі.

Восемнастка ідзе незалежніцкім беларускім шляхам!

Усе як адзін мужчыны і жанчыны 25 мая на выбары!
Ані воднага голасу польскім партыям!
Ані воднага голасу панскаму падлізьніку Янку Станкевічу!
Сьцеражыцеся тых, што йдуць з камуністымі!

Няхай жыве восемнастка!
Няхай жыве Беларускі Народ!!!

Беларускі выбарны камітэт Ашмянскага павету.

Дзятловіч Фр.	Пашкевіч Пав.
Саладуха Ст.	Заянчкоўскі Язэп
Жукоўскі Фр.	Дэрвіс Ант.
Баслыкевіч Бол.	Пясэцкі Марц.
Сальмановіч Язэп	Кетрас Пётр
Гедройць Аполёнія	Дэрвіс Язэп
Стасіловіч Конст.	Грабоўскі Улад.
Дэрвіс Вацл.	

Усьведамленьне вёскі.

Надыходзячыя выбары ў Лідзкім вокрузе выяўляюць шмат беларускага ўсьведамленьня ў народных масах. Гэта відаць ня толькі ў тых паветах, дзе гэтае ўсьведамленьне разбудзілася і прывілося даўней (пав. Вялейскі, Маладэчанскі і Валожынскі), але і ў тых, якія польскія статыстыкі залічвалі і залічваюць да паветаў чыста польскіх, як напр. Лідзкі і Ашмянскі. У гэтых „чыста польскіх“ паветах, а асабліва ў павеце Ашмянскім, даходзіць да таго, што агітатарам выступаючым ад польскіх партыяў „Строніцтва Хлопскага“ ці „П.П.С.“ сяляне не даюць гаварыць папольску... Крычаць, каб гаварылі пабеларуску, а калі ня ўмеюць, дык гоняць вон. Гэтак было ў Ашмяне. Не памагаюць тут салодкія ветлівыя звароты: „товажышэ, товажышэ!“ — сяляне ня толькі не прызнаюцца да ніякага таварыства з гэтымі панамі, але нават гэтакіх „таварышаў“ слухаць ня хочуць... „Пэпээсы“ ў адказ на гэтыя дамаганьні сялян раскідаюць ужо цэлымі тысячамі адозвы, друкаваныя пабеларуску... Ці гэта што паможа, мы вельмі сумняваемся.

А сумняваемся дзеля гэтакіх прычын: прадусім, як мы ўжо сказалі, у сялян прабудзілася вялікая нацыянальная сьведамасьць, гэтая сьведамасьць памагае нашаму селяніну адрожніць польскую партыю ад беларускай, хацяб гэна партыя ўжывала і беларускай мовы. Далей, гэтая сьведамасьць дае магчымасьць нашаму сялянству пазнаць нават „свайго“ ваўка, калі той прыбіраецца ў беларускую аўчынку і ідзе туманіць народныя масы. І так, у Вішневе (Валожынскім) дня 23.IV г.г. сяляне раілі выступаўшаму тамака з беларускай прамовай памагальніку „слаўнага“ полёнофіла Янкі Станкевіча, студэнту Ст. Станкевічу, гаварыць папольску... — Чаго ты яшчэ дым у вочы пускаеш—казалі яму—гавары ты ўжо сусім папольску, тады прынамсі Ясна будзе. Каліж студэнт С. Станкевіч далей хацеў баламуціць народ, дык, як відаць з карэспандэнцыі, якую друкуем у гэты нумары нашай газэты, мусіў уцякаць ад народнага гневу...

І так, нават ад нашых полёнафілаў народ вымагае яснасьці; не памагае здраднікам беларуская мова, на фарбаванай аўчынцы народ ужо пазнаецца, а так-жа і на чыста польскіх партыях: Строн. Хлопскім і П.П.С., якія задумалі нават на нашай вёсцы ладзіць свае вечы і паходы.

Не паможа ім у гэтай справе нават ужываньне беларускай мовы — трывалкага ўплыву на беларускія масы яны ня будуць. Ад сябе скажам — што і не павінны мець, бо гэта чужыя, польскія партыі, ім болей ляжыць на сэрцы дабро польскага народу як беларускага.

Якіж выхад з усяго таго, што мы ска-

залі? Выхад той, што беларушчына расьце, наша вёска ўсьведамляецца і нацыянальна і соцыяльна і гоніць ад сябе сваіх ворагаў. Нашы вясковыя дзеячы ў большасьці паветаў правялі сваю работу сусім добра і ўжо прыводзяць народ да поўнага нацыянальнага і соцыяльнага ўсьведамленьня.

Але што далей? Куды мае ісьці гэтая ўжо сьведамая, беларуская маса? Вось над гэтым пытаньнем трэба прызадумацца.

Ня можам мы ёй даць зараз-жа сваей дзяржаўнасьці, дзе-б магла выявіцца народная творчасьць і разбуджаная энэргія, ня можам нават даць сваіх школаў і самаўрадаў, бо гэтыя ўстановы залежаць ад іншых дзейнікаў і здабыць іх нашаму селяніну даволі трудна, часам нават немагчыма. Дык што-ж астаецца рабіць? **Астаецца нам будаваць свой культурны і эканамічны фронт.** Бяз культурных і эканамічных установаў народ слабы: ён падобны да бурлівага мора, якое шуміць падчас непагоды, ён падобны да сыпучага пяску, які пераносіцца з месца на месца... А нам трэба ўжо нечага трывалкага і моцнага. Нябошчыца „Грамада" дрэнна рабіла, што незварочвала належнай увагі на культурны і эканамічны фронт, яна прайшла як бура над нашай зямлёю, не пакідаючы па сабе мацнейшых культурных і эканамічных здабыткаў.

Дык культурная праца, арганізацыя культурных працаўнікоў і паглыбленьне беларускай культуры ў масах — гэта адно заданьне. А другое — закладаць коопэратывы, пашыраць дзейнасьць гаспадарча-прамысловага банку, гуртаваць сяброў—пайшчыкаў, уцягіваць вёску ў арганізаванае эканамічнае жыцьцё — вось будзе праца, на якую чакае ўжо ўсьведамленая вёска.

Дык культурнікі і эканамісты, цяпер на вас пара! Палітычныя дзеячы прывялі ўжо шмат паветаў да народнага ўсьведамленьня, вы павінны прыясьці **да народнага будаўніцтва.**

Чытайце і пашырайце „Бел. Крыніцу".

Каня куюць — жаба нагу падстаўляе.

У Лідзкім выбарным вокрузе, як ведама, адбываецца цяпер прадвыбарная агітацыя прад папоўнымі выбарамі ў Сойм, якія адбудуцца 25 траўня с. г. На тэрыторыі Лідзкага выбарнага вокругу ў паветах: Ашмянскім, Валожынскім, Вялейскім, Лідзкім і Шчучынскім, беларуская сялянская і работніцкая маса па крысе, як ужо чуваць, выказываецца, па якім шляху ідзе і за які сьпісак будзе галасаваць.

Да нас надходзяць весткі з гэтых паветаў ад арганізацыяў і адзінак, што беларускія сяляне, а такжа і работнікі беларускіх правінцыяльных мястэчкаў настроены ідзёва па беларуску незалежніцку і зьбіраюцца галасаваць за № 18. Гэтую прадвыбарную ўсьведамляючую працу сярод шырокіх беларускіх мас праводзяць сьвятлейшыя і больш дзейныя адзінкі, арганізуючы на мяйсцох выбарныя камітэты.

Народ заварушыўся і пачалася праца саматугам. Народ, шукаючы выхаду, знайшоў яго у незалежніцкай ідэолёгіі і масава выказываецца, што будзе галасаваць за свой беларускі сьпісак № 18.

Ня сьпяць і ворагі. Янка Станкевіч, цяпер, таксама як і ў выбарах у 1928 г., стараецца разьбіць адзіны беларускі фронт, намаўляючы людзей, каб галасавалі за яго. Ня маючы літэральна ніякіх уплываў у масах, Янка Станкевіч праз найміта студ. Ст. Станкевіча агітуе па мястэчках і вёсках. Але гэтага маладога полёнафільнага прыслужніка сяляне адусюль гоняць вон і гэтакім спосабам сама беларуская маса ліквідуе дэфэнзыўных гадунцоў і загараджывае дарогу полёнафіліі ў беларускую вёску.

Бачачы гэткае няшчасьце на полёнофільскім фронце, Луцкевічаўскі „Наперад", выступіў у атаку проціў беларускага незалежніцкага сьпіску № 18. У нумары 15 „Наперадў", галоўным заправілам якога ёсьць ведамы палітычны прахадзімец Антон Луцкевіч, які так лёгка перескаківаў ад белага арла да краснага знамені і назад, ніколі незатрымліваючыся ў беларускім народным цэнтры і знаходзячыся цяпер у рэдакцыйнай калегіі полёнофільскай часопісі вышэй успомненага „Наперадў" піша, што найлепшы для беларускіх масаў Лідзкага выбарнага вокругу — гэта сьпісак № 41 Янкі Станкевіча.

Словам, полёнофілы змабілізавалі ўсе свае сілы і пусьцілі ў атаку проціў сапраўднага беларускага сьпіску № 18. Але голас іхны, як бачым, у народзе беларускім послуху ня мае. Робяць яны гэта мусіць дзеля таго, што іхны гэта абавязак, каб разьбіваць беларускую еднасьць. Ведама, калі нанятыся, дык і запрадаліся. Але ўся іхняя работа ў народзе выглядае так, што дзе „каня куюць — там жаба нагу падстаўляе.

Камуністычны Суд засудзіў украінскіх незалежнікаў на 203 гады вастрогу.

У Харкаве праз 6 тыдняў бальшавіцкі Суд судзіў Украінскіх змагароў за незалежнасьць сваей бацькаўшчыны і ўсіх разам дня 19 г. м. засудзіў на 203 гады вастрогу.

Акупацыйная ўлада на Украіне паставіла ў стан абвінавачаньня 45 украінскіх змагароў за вольнасьць паняволенага Украінскага Народу, якія на чале з праф Ефрэмавым праводзілі дзейнасьць дзеля вызваленьня Украінскага Народу з пад дзікай акупацыйнай улады расейскіх камуністаў.

У працягу шасьці тыдняў Суд сьцьвердзіў, што падсудныя належалі і кіравалі украінскімі арганізацыямі: „Брацтва Украінскай Дзяржаўнасьці", „Саюз Вызваленьня Украіны", „Саюз Украінскай Моладзі" і дамагаліся адарваць Украіну ад Расеі.

Сьцьвердзіўшы гэта ўсё, бальшавіцкі Суд цынічна ўжываючы ў прысудзе „У імені Украінскай Соц. Рад. Рэспублікі", засудзіў лепшых сыноў украінскага народу на ад 3 да 10 гадоў цяжкай вязьніцы, толькі за тое, што яны мелі на мэце свеай дзейнасьці адарваньне Украіны ад Расеі і ўтварэньне Незалежнай Украіны.

Калі-б на Украіне была ўлада сапраўды Украінскай Соц. Рад. Рэспублікі, а не акупацыйная ўлада Масквы, дык засуджаныя замест цяжкага вастрогу напэўна атрымалі-бы адзнакі ганаровай заслугі.

Вось і гэны працэс яшчэ раз пацьвердзіў моцную лапу Расеі на Украіне, якая, прыкрываючы сваю „единонедѣлимость" камуністычным фэдэралізмам, імкнецца таксама, як і пры царох, да паняволеньня народаў.

Але ня трэбм забывацца, што перажываем часы адраджэньня і вызваленьня паняволеных народаў. Украінскі народ нацыянальна і культурна жыве, дык прыйдзе час; пазбавіцца ён няпрошанай апекі.

Старaверы.

Спадак мінуўшчыны.

У сярэдзіне XVII-га стагодзьдзя, патрыярхам расейскае праваслаўнае царквы быў Нікан. Ён ня быў па паходжаньню ані расейцам, ані нават славянінам, ён быў мардвін і таму быў чужаком народнаму духу расейца й нават мове ягонай. Стаўшы патрыархам, Нікан захацеў зрэфармаваць царкву. Якая гэта была рэформа, можна бачыць па наступнаму: замест зрушчанага імя Хрыста „Ісус", якое для расейскага вуха сталася зусім родным, увадзілася чужацкае „Іісус", замест хрысьціцца двума пальцамі, як было ў звычаі дагэтуль, загадана было трыма й г. д. Калі прыхільнікі старадаўнасьці адкрыта пачалі пратэставаць проці непатрэбных рэформаў, Нікан на царкоўным саборы ў 1667 г. кінуў на непаслухмяных праклён, а пасьля сыпнуў на іхныя галовы ўсе магчымыя ў тую пару кары. Іх палілі агнём, секлі катаўскімі сякерамі, ссылалі ў Сібір, ім рэзалі языкі, вушы. З імі ня лічыліся, як з людзьмі, іх проста хацелі выгубіць, як шкодную зьвярыну. І ўсё гэта за прывязаннасьць да старых звычаяў, за ідэі, якія не маглі быць шкоднымі ані царкве, ані дзяржаве, ані грамадзянству.

Мучаная за вонкавую форму, пераважна ня маючую ніякай сувязі з унутраным зьместам рэлігійнае навукі, мучанікі бачылі ў гэтай форме найдаражэйшае багацьце сваёй душы. Матка праз мукі народу ня бачыць цаны свайму дзіцяці: гэтак для старавераў літара закону асьвяцілася крывёй мучанікаў за яе. Літара замяніла навуку, форма сталася зьместам.

Са сваімі мучыцелямі мучанікі змагаліся, як маглі: палілі самі сябе жыўцом, уцякалі ў глухія лясы, шукалі прытулку за межамі айчыны. З гэтай няроўнай барацьбы старавры вынесьлі толькі адзінае сваё багацьце, непарушную форму, літару рэлігійнае навукі. З усяе рэшты духоўнага багацьця яны асталіся да ніткі абдзёртыя. Ад іх сілком адабралі давер да чалавека, пачуцьцё паважаньня чужой уласнасьці, свабей асабістай годнасьці, ахвоту да трывалай працы, здольнасьць да самакрытыкі й г. д. Стагодзьдзі палажылі на іх псыхіку сваё ад'емнае кляймо.

З гэткаю зламанаю душой старaверы ўступілі ў сучасную эпоху, у якой ужо няма фізычных караў за рэлігію. Схамянуўшыся, яны ва ўсіх краёх кінуліся арганізавацца. На агульна-стараверскім з'езьдзе ў Вільні ў 1926 г. старaверы нашыя надалі сваёй царкве такую-сякую вонкавую арганізацыю, здаволеныя вельмі, што й ім дазволена „людзьмі звацца". Але на гэтым пакуль што й канец. Тымчасам перад стараверамі стаіць аграмадная задача: залячыць свае духоўныя раны, атрыманыя ў пару няволі і ўвясьці сябе ў сям'ю культурных народаў. Да гэтай бо пары яны напружывалі ўсе свае сілы на барацьбу за форму, якая сталася для іх ідэалам. Адвабокая дзейнасьць скалечыла душу, скасьціяніла яе... Ідэал дапяты, перастае быць ідэалам. Ён мае цану толькі тады, калі ён ня ёсьць, а й ня можа быць дапяты. Бяз ідэалу ніякі народ ня можа існаваць. Народ без ідэалу застанецца гноем на ніву суседніх народаў. Трэба перавыхаваць народ, паставіць перад ім новыя вехі, якія паказалі-б яму кірунак сьцежкі ў новае жыцьцё й павясьці яго па гэтых вехах. Дзеля гэтага трэба мець сваю інтэлігенцыю, а старaверы яе ня маюць.

Тут-жа насуваецца сама сабой паралель паміж беларусамі й стараверамі. Як адны, гэтак і другія ў сваёй не салодкай мінуўшчыне згубілі свае інтэлігентныя сілы, якія за жыцьцёвыя выгады паперaходзілі да варожых станаў: стараверскія да пануючай царквы, беларускія да польскае ці расейскае народнасьці. Аднак беларусы ўсё-ж-ткі шчасьлівейшыя за стараверў: ім ня выпала на долю разбягацца па ўсяму сьвету за шуканьнем прытулку. Жывучы згорненай масай, беларусы пры першай дробнай магчымасьці схамянуліся й да гэтай пары ўжо патрапілі прынамсі паставіць тыя вехі, аб якіх была мова. Цяпер перад беларусамі астаецца толькі, расшпіліўшы каўнер і закасаўшы рукавы, сьмела расцярэбліваць перад сабой намечаную сьцежку.

Каб стварыць сваю інтэлігенцыю, трэба мець сваю школу. Ані мы, ані старaверы яе ня маемо й кормімся тымчасам духоўнай стравай з аднае міскі.

Як гэтая страва выходзе нам на здароўе, аб гэтым іншым разам.

Хроміч.

Скаваньне выбараў у Сьвянцянскім вокрузе.

Дня 14 г. м. Найвышэйшы Суд скасаваў у Сьвянцянскім вокрузе выбары ў Сойм, якія адбыліся ў 1928 г. Паноўныя выбары ў Сойм у Сьвянцянскім вокрузе ўжо вызначаны на дзень 13 ліпня с. г.

З выбарнага фронту Лідзкага вокругу.

Конфэрэнцыя ў Ашмяне.

Дня 25 красавіка с. г. адбылася ў Ашмяне павятовая прадвыбарная конфэрэнцыя прадстаўнікоў гмін Ашмянскага пав. На гэтай конфэрэнцыі пастаноўлена ўтварыць беларускі павятовы выбарны камітэт сьпіску № 18.

У Камітэт увайшлі:

1) ад гміны і места Ашмяны: Жукоўскі Фр., Саладуха Ст., Баслыкевіч Бол., Сальмановіч Язэп., Крэчонак А., Гедройць Аполёнія.

2) ад гміны Граўжыскай: Дзятловіч Фр., Стасіковіч Конст.

3) ад гміны Палянскай: Пашкевіч Пав., Заянчкоўскі Язэп.

4) ад гміны Куцэвіцкай: Дэрвіс Ант., Дэрвіс Язэп, Дэрвіс Вацлаў.

5) ад гміны Гальшанскай: Грабоўскі Ул.

Камітэт пастанавіў выдаць адозву да беларусаў выбаршчыкаў Ашмянскага пав., якую зьмяшчаем у гэтым нумары.

— У Валожыне дня 24 г. м. адбыўся прадвыбарны мітынг 18-кі і ўтварыўся павятовы выбарны камітэт беларускага сьпіску № 18.

З Беларускага жыцьця.

Варункавае звальненьне з вастрогу б. пасла Б. Тарашкевіча. Полскі міністр справядлівасьці дня 26 г. м. загадаў спыніць трыманьне ў вастрозе б. пасла Б. Тарашкевіча.

Паводле газэтных вестак, для Б. Тарашкевіча, Рак-Міхайлоўскага і Мятлы Прэзыдэнт мае́цца даць амнэстыю, але яшчэ пакульшто гэта амнэстыя Прэзыдэнтам ня выдана.

Міністар Справядлівасьці, не чакаючы амнэстыі, загадаў выпусьціць з вастрогу Б. Тарашкевіча варункова, аж да выясненьня справы яго амнэстыі. Тарашкевіч ужо на волі.

Суд над рэдактарам Мар'яном Пецюкевічам і выдаўцом Янкам Багдановічам час. „Шляху Моладзі“, абвінавачанымі па 132 арт. Кодэксу Карнага з прычыны канфіскаты „Шляху Моладзі“ № 8 за 1929 г., адбудзецца ў Віленскім Акружным Судзе 12 траўня с. г.

Канфіската „Шляху Моладзі“ № 4. 16 красавіка 1930 г. Віленскае Гарадзкое Старостава сканфіскавала № 4 „Шляху Моладзі“ за зьмяшчэньне вершу Ул. Казлоўшчыка — „Беларусь, устань!“ у якім ўлады бачаць праступніцтва па 129 арт. Кодэксу Карнага.

„Сьветач Беларусі“. Пад такім загалоўкам пачала выходзіць у Вільні „Царкоўна-Нацыянальная“ часопіць для беларусаў. Часопісь гэная ёсьць органам „Бел. Прав. Камітэту“, старшынёй якога зьяўляецца ведамы „чэсны“ поленофіл Тодар Вярнікоўскі, а сэкрэтаром студ. С. Сарока. Гэны „Сьветач Беларусі“ мае быццам выходзіць два разы на месяц.

Пасольскі мітынг адбыўся ў м-ку Вялкалата 13 красавіка с. г. Прамаўляў на мітынгу пасол Каруза.

Яшчэ аб зьезьдзе каталікоў беларусаў і літоўцаў. Зьезд каталікоў беларусаў і літоўцаў, які назначаны на нядзелю 4 траўня с. г., адбудзецца, як даведываемся, у салі „Крэсовай“—Завальная вул. №1 з наступным парадкам: рэфэраты беларускі і літоўскі на тэму: „палажэньне, патрэбы і заданьні каталікоў беларусаў і літоўцаў у Краі ў нашых часах“. Даклады з мяйсцоў і рэзалюцыі. Там-жа на гэтым зьезьдзе мае быць выбраны сталы Камітэт для акцыі каталіцкай беларускай і літоўскай.

Роднай „Беларускай Крыніцы“ і ўсёй Б. Х. Д. у Вільні з прычыны сьвят Вялікадня шлю якнайшчырэйшыя пажаданьні і ад душы дзякую „Б. Крынічцы“, што прыплывала да мяне і паіла спрагненую душу маю ў горкай чужыне, крышталоваю вадзіцай веры і надзеі ў сьветлую будучыню.

Хай-жа жыве „Беларуская Крыніца“ і БХД!

Верым, што калі **„Хрыстос Ускрос — ускрэсьнема і Мы!“**

З брацкім прыветам удзячны

16. IV. 1930 г. *Сяргей Пяюн.*

З польшчы.

Ня будзе дахадовага падатку да 15 гэктараў. Вышаў новы закон, што за 1930 год ня трэба будзе плаціць дахадовага падатку хто мае менш 15 гэктараў зямлі. У гэтым законе такжа сказана, што пры абліччэньні падатку дахадовага за 1929 год будуць лічыць цану жыта на 4 зл. пуд (да гэтуль лічылі па 7 зл. пуд); гэтакім чынам за 1929 год падатак дахадовы будзе амаль не ўдвая меншы, як за 1928 год.

Паменшаньне кары за незаплачаньне ў пару падаткаў. Міністэрства Скарбу загадала зьменшыць кару за незаплачаныя ў пару падаткі з 2% на 1% за кожды перацёрмінованы месяц, г. зн. што дагэтуль плацілася па 2 грошы за 1 злот, а цяпер трэба плаціць па 1 грашу з 1 зл.

Закон гэты важны толькі да 31 жнiўня с. г.

Хочуць склікаць Сойм. Усе польскія партыі ў Сойме вядуць між сабой гутаркі, каб падаць просьбу да Прэзыдэнта аб склікаваньні Надзвычайнай Сэсіі Сойму. Паводле апошніх вестак ужо згаварыліся блізу ўсе і будуць дамагацца, каб быў склікаемы Сойм у палове траўня.

Калі Сойм будзе склікаемы, то пэўна будзе на ім пастаўлена жаданьне Сойму прыняты вотум недаверу ўраду Слаўка, а тады можа наступіць развязаньне Сойму і новыя выбары, аднак апошнімі днямі пайшла пагалоска, што ўсёжтакі урад, баючыся каб не прайграць на новых выбарах, пастараецца Сойму не разганяць.

Бомба ў савецкім пасольстве ў Варшаве. У суботу 26 г. м. у савецкім пасольстве ў Варшаве знайшлі ў коміне аграмадную бомбу, якая каб узарвалася—зьнішчыла-б увесь дом пасольства. Варшаўская паліцыя западозрэвае, што гэта зрабілі расейскія эмігранты-манархісты.

З заграніцы.

Бальшавікі праігралі вайну з рэлігіяй. Савецкія газэты з нездаваленьнем пішаць, што дзякуючы аслабленьню змаганьня з рэлігіяй народныя масы на сёлетні Вялікдзень, як ніколі да гэтуль, паказалі сваю рэлігійнасьць. Асабліва выявілася рэлігійнасьць на Беларусі.

У Менску на Вялікодную ноч у цэрквах і касьцёлах людзі не маглі стаўпіцца — так многа йшло маліцца.

Чуць не пастраляліся. Латвійскія газэты пішуць, што „красная армія“ пачынае бунтавацца проці колектывізацыі сялян у Савецах. У Ленінградзкім вокрузе на партыйных сабраньнях краснаармейцы пастанавілі чынна выступіць проці сялянскіх камун (калгасаў) і заявілі, што яны пойдуць на ўспакаеньне сялян, каторыя бурацца, аж сам Літвінаў і Варашылаў мусілі паехаць на места і ледзь успакоілі абяцаючы, што больш заганяць у калгас сілай ня будуць. Пасьля ў гэтай справе пашлі да Сталіна Варашылаў і Крупская ды падчас гутаркі Крупская палезла ў кяшэнь па насатку. Сталіну здалося, што тая хоча яго застрэліць, схапіў рэвольвэр і каб не Варашылаў—пэўне-б выстраліў у Крупскую.

Сэсія Лігі Нацыяў у Жэнэве адбудзецца 12 траўня с. г. Найважнейшай справай гэтай сэсіі будзе пытаньне, ці магчыма будзе стварыць злучаныя штаты Эўропы.

Чуваць, што пачынальнік гэтай ідэі, францускі міністр, Брыян, спадзяецца, што яму на гэты раз удасца дайсьці да некаторага паразуменьня ў гэтай справе.

Эгіпт дамагаецца незалежнасьці. У Лёндане—сталіцы Англіі цяпер адбываюцца нарады эгіпскай дэлегацыі з англійскім урадам аб узаемных адносінах Эгіпту і Англіі. Эгіпская дэлегацыя дамагаецца поўнай незалежнасьці Эгіпту і каб Англія забрала сваё войска з іхнай тэрыторыі. Эгіпцяне спадзяюцца, што Англійцы, дзякуючы непарадкам у Індыі пойдуць на вялікія ўступкі. Англія-ж баіцца, што тады і Індыя гатова вастрэй выступіць аб свае правы.

Індыйцаў ціснуць. Англійскія ўлады засудзілі некалькі дзесяткаў асоб на 3—9 месяцаў турмы за непаслухмянасьць англійскаму ўраду у Індыі, у тым ліку і 2 сыноў Гандзі.

З краю.

Цікавая памятка даўнасьці. На 36 вярсьце ад места Ашмяны, у маленькім засьценачку Акаменка, у леташнім годзе селянін Франук Стэфановіч, аручы сваю ніву, зачапіўся плугом за нейкі камень. Думаючы, што гэта звычайны падгрунтовы камень г. зв. патаемнік, Стэфановіч пачаў яго адлюжываць, каб вывернуць на мяжу. Адкапаўшы яго, Стэфановіч пабачыў, што ўцэласьці ён гэтага каменьня ня выверне, бо за вялікі. Тады ён пачаў яго разьбіваць, каб выбраць па куску. Аднак удалося яму адбіць толькі невялікія кускі, а далей камень не палаваўся.

Разьбіваючы камень, Стэфановіч мімаволі зьвярнуў увагу на будову як і на асаблівую форму каменя.

У Стэфановіча, чалавека даволі ачытанага і бывалага, зрадзілася дагадка, што гэта не звычайны камень і ён жартам пачаў казаць людзям, што знашоў даўнага, паганскага бажка. Пасланкі гэтыя дайшлі да Ашмяны і прыехаўшая адумысловая камісія сьцвердзіла, што гэта запраўды даўны балван (фігура) нейкага бажка.

Высланы рэд. „Бел. Крыніцы“ адумысловы корэспондэнт сьцьвердзіў, што гэта ёсьць ляжачая ніц фігура з цэманту, часткова зьнішчаная часам і вадой. Як форма, так і будова выкапалішча сьцьвярджаюць, што гэтай памятцы даўнасьці на 1000 гадоў.

У палавіне траўня мае прыехаць з Варшавы адумысловая камісія, якая хоча пачаць далейшыя раскопкі. Варта, каб гэтай справай зацікавіўся такжа і Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры і можаб ён памог Стэфановічу выясьніць яго права да даволі цэннага выкапалішча. п.

Арышт б. сэкрэтара Бел. Сял.-Раб. Пас. Клюбу ў Глыбокім. Гэтымі днямі ўлады арыштавалі і пасадзілі ў вастрог на Лукішках у Вільні б. сэкрэтара Бел. Сял.-Раб. Пас. Клюбу ў Глыбокім Сьцяпана Ігнатовіча.

Ігнатовічу сьледчыя ўлады закідаюць проціўдзяржаўную комуністычную дзейнасьць.

Праўныя парады.

В. Віраб'ю І. І Гутовічу.

Пытаньне: Нашая зямля знаходзіцца кругом возера. У гэтым возеры з даўных часоў нашыя дзяды, бацькі і мы без ніякіх запярэчаньняў з нічыйго боку лавілі рыбу. Праз нашую зямлю да гэтага возера няма ніякай дарогі. Да гэтага возера праўны доступ мелі і маем толькі мы ўласьнікі, акружаючай возера зямлі. Цяпер у сёлетнім годзе зьявіўся нейкі быццам арэндатар гэтага возера і забараніў нам лавіць у гэтым возеры рыбу. Што маем рабіць, каб вярнуць тыя правы, якімі мы карысталіся да гэтага году адносна ўспомненага возера?

Адказ: З Вашага пытаньня відаць, што Вы бясспорна з даўніх часоў карысталіся правам лоўлі ў возеры рыбы, а цяпер нехта самавольна пагвалчае Вашыя правы. Самавольны паступак забараняючага Вам лавіць рыбу ёсьць беспраўны. Вам трэба падаць гэтага арэндатара і таго, хто яму аддаў у арэнду возера, у суд павятовы з просьбай вярнуць Вам тыя правы, якімі Вы карысталіся да гэтага часу. Аб уласнасьці возера Вам цяпер пачынаць справы ня трэба, аб тым

пачне пасьля гэтай справы Ваш праціўнік. У суд падайце толькі аб тым, што Ваш праціўнік нарушыў Вашыя правы адносна возера, забараняючы Вам лавіць у ім рыбу, у якім Вы лавілі яе бясспорна з даўных часаў. Гэты факт трэба сьцьвердзіць на судзе сьведкамі і прасіць суд вярнуць Вам тыя правы, якія самавольна нарушыў Ваш праціўнік. Справу ў судзе Вы павінны выйграць.

Калі да гэтага возера, акружанага вашай зямлёй, няма дарогі, праз сваю зямлю можаце забараніць ня толькі праезд, але нават і праход пехатой.

З Вільні.

Безрабоцьце ў Вільні ўсё расьце. Не зважаючы на тое, што і вясна на дварэ, а безрабоцьце ў Вільні ня то што не спыняецца, але ўсё расьце.

У працягу мінулага тыдня ў Вільні зарэгістравана 3.777 безработных. Лік безработных у параўнаньні з папярэднім тыднем павялічыўся на некалькі асоб.

Аб гаспадарцы.

Авёс.

Шкода вялікая дзеіцца земляробству з тае прычыны, што яно не дацэніве аўса; шкода тымбольшая, бо авёс адпаведна дагледжаны дае ўраджаі большай цаны, чымся самая нават пшаніца. Зерне аўса ёсьць найлепшым кормам для коняў, аўсяны жыр (кісель) ведамы кожнаму беларусу, аўсяны крупы вайной былі стравай чалавека; як корм для маладых нова адстаўленых цялят і жарабят авёс ня можа быць віякай расьцінай гаспадарчай заступлены; для дойных кароў авёс прыгодны таксама. Аўсяная салома (аўсянка) ёсьць пошар для скаціны, належыць да найлепшай. Гэтулькі, а нават шмат больш дае авёс земляробу. Прыглядзьмося-ж цяпер чаго ён ад земляроба патрабуе.

Авёс ёсьць расьцінай **вогкіх** (вільготных) **палёў**; а знача ўраджай яго залежным ёсьць ад таго, ці лета не выпадзе сухое, асабліва прад выплываньнем. Засеенаму зярняці ў глебе ня шкодзяць ані мокрасьць, ані мароз, затое чуткім ёсьць авёс на сухую і сьцюдзёную пагоду. На грунты авёс непераборлівы, будзе расьці на кожнай глебе з выняткам сухога лятучага пяску і глебы шмат вапністай, дзеля нястачы вогкасьці ў гэтых грунтох. Цяжкія грунты гліістыя, заараныя кіслыя сенажацы, спушчаныя ставы і сажалкі вельмі падходзяць пад авёс.

У гаспадарчым севазвароце авёс расьце па кожнай расьціне, нават сам па сабе. Гэтага аднак рабіць ня трэба, бо авёс вельмі „высмоктывае" глебу. Таксама пасьля ячменю. Найлепш расьце авёс на бульбяні́шчах і на канюшыні́шчах. Гнаеньне пад авёс залежным ёсьць ад таго, пасьля якой расьціны авёс сеіцца. Найбольшае запатрабаваньне кладзе авёс на а з о т, якога вымагае шмат **і ад якога ў першай чарзе залежыць** ураджай аўса. Меншыя ад азоту запатрабаваньні кладзе авёс на патас (калі), якім трэба гнаіць пад авёс толькі на глебах л ё г к і х, пяшчаных. На гэткіх (лёгкіх) глебах найлепш уродзіць авёс па зялёным гнаеньні (канюшыне, лубіне, сачыўцы, гаросе і г. д.), заараным увосені з даданьнем на h.*) 5—6q.**) каініту (увосені). Азот дадаецца пад авёс найлепш у форме серна-амоннай солі $(NH_4)_2$ 50q), $2^1/_2$—3q. на ha. Замест гэтай солі можна даць на ha 2 — q. азотняку, а замест каініту—$1^1/_5$ q потасовай солі 20% ай. Поле, якое гноіцца раз прынамся за 3 — 4 гады хляўным гноем, не патрабуе сумыснага дагноіваньня штучнымі гнаямі фосфарнымі. Нельга прапусьціць з віду своеабразнасьць аўса што да запатрабаваньня на вапну: авёс ня сьцерпіць большай колькасьці вапны ў глебе — вапна сушыць глебу, — але ня будзе расьці і там, дзе вапны сусём няма (дзе не расьце канюшына) Знача мернае мноства вапны авёс патрабуе, але ня сьцерпіць безпасярэднага вапненьня паленай вапнай (CaO).

Трудна азначыць пару сяўбы аўса. Агулам узята лепш **сеіць авёс за рана, чымся за позна**. Трэба пры гэтым пагадзіць з сабою такія супярэчнасьці, як высокая, бо аж 4 — 5 высокая цяплыня прарастаньня (у жыта толькі 1—2 C), вялікае запатрабаваньне на вогкасьць (вільгаць) у глебе, чуткасьць на зімно (сьцюжу), павольнасьць росту, найбольшая з ўсіх збажавін падлегласьць зельлю (асабліва сьвірэпцы) і няздольнасьць да перапрываньня сухамені (сушы). Адны з гетых вымогаў аўса патрабуюць сяўбы раннай, іншыя наадварот — познай: трэба пагадзіць. Ранная сяўба патрэбна перад усім, калі вясна спозьнена. Пры нармальнай вясьне сеіцца авёс не чакаючы пакуль поле зусём абсохне. Сеіць трэба **глыбока**, пад цяжкую барану (з рэдкімі зубамі), а навет і пад плуг. Найлепш, натуральна, сеіць авёс с е я л к а й, якая наагул па плугу і баране ё с ь ц ь н а й п а т р а б н е й ш а й г а с п а д а р с к а й с н а с ь ц ю. Засеены авёс на грунтах лёгкіх па забаранаваньню ішчэ валкуецца. Валкуецца засеены авёс і на глебе цяжэйшай, але ў сьлед за валкам мусіць ісьці і барана, бо сяўба „засела-б" у саскарупеўшай глебе. Калі-б па засееньні аўса здарыўся вялікі дождж, дык поле такое трэба разбаранаваць, **не чакаючы** пакуль абсохне — авёс гэта вытрымае. Барануецца авёс і тады, калі ў ім заўважыцца шмат шкоднага заўсёды зельля.

На сяўбу трэба выбіраць зерне аўса што найцяжэйшае і сеіць на ha 150—200 кілёграмаў (10—12 пудоў).

Калі ў авёс усеіваецца канюшына, дык робіцца гэтак: прыкрываецца авёс, сеіцца канюшына і валкуецца. Калі-б грунты былі цяжэйшыя і валкаваньня не пазвалялі, дык сеіцца канюшына тады толькі, як авес абыйдзе: авес барануецца, сеіцца канюшына і валкуецца.

Звычайны ўраджай аўса з га не павінен быць меншы 20q (125 пудоў) зерня і 30q саломы. (*З працаў інж. Ад. Клімовіча*).

*) га — гэктар.
**) q — квінталь, мэтрычны цэнтнар — 100 кілёграмаў — 6 пудоў і 10 фунтаў.

Да нас пішуць.

ЯНКУ СТАНКЕВІЧА ЗНАЮЦЬ і АДУСЮЛЬ ГАНЯЮЦЬ.

м. Вішнева, Валожынскага пав. У наша мястэчка цяпер пачалі што-серады прыяжджаць ад рожных партыяў агітатары.

Спачатку паказаліся агітатары з „Stronnictwa Chłopskiego" і нам абяцалі ўсяго-чыста, чаго толькі селянін захоча, нават таго, чаго і на зямлі няма. Але годзі дудкі круціць. Нашы сяляне ня дурныя, ужо дзякаваць Богу ўсьвядаміліся так, што ніхто не ашукае. Узялі гэтых „Хлопаў" і прагналі з Вішнева. Цяпер ужо не адзін не паказываецца.

Вось на 4-ты дзень Вялікадня, якраз у сераду, прыехаў у Вішнева агітатар „спадара" Янкі Станкевіча, студэнт Ст. Станкевіч і пачаў намаўляць сялян, каб галасавалі за Янкаў сьпісак. У часе яго мітынгу сяляне беларусы пачалі з яго насьмяхацца — крычаць: „гавары папольску," які-ж з цябе беларус!" А з другога боку разлягаліся крыкі: „знаем мы добра Янку Станкевіча, гэта-ж ён тут за Вішневам купіў 600 гэкт. зямлі і залажыў 5 кнігарняў", а з іншых бакоў крыкі разносіліся: „гэта полёнафіл, галасуе ў Сойме разам з пілсудчыкамі, з „jedynkaj", нам такіх ня трэба, мы павінны галасаваць за свой сьпісак № 18.

Праз пару мінут раздаўся крык: „далой яго з возу! Гэта абманшчык, падкупшчык, здраднік." Сяляне ўсе кінуліся на яго, сцягнулі з возу, далі добра ў каршэнь і так бедны „спадароў" агітатар мусіў памаленьку цягнуцца дамоў.

Вішнеўскі.

МАРАЛЬНЫ ТРУПЯК.

Перхавічы, Баранавіцкага пав. Чалавек, згубіўшы веру ў Бога, прывыкшы да немаральных паступкаў і ня маючы ані крыхі хрысьціянскага сьвятла ў галаве, а пачуцьця ў сэрцы, ёсьць проста ходзячым трупам, ад якога навокал разносіцца маральны смурод яго ных паступкаў. Ёсьць гэтакія маральныя трупякі сярод беларусаў, якія сваім маральным смуродам стараюцца атруціць беларускіх сялян, ёсьць гэтакі маральны трупяк і ў нашай вёсцы.

Наш маральны трупяк Язэп займаецца не адсяньня ўсялякімі даносамі і цёмнымі справамі. Гэты наш свае й гадоўлі маральны трупяк сваімі паступкамі паказвае, што ён пранікнуты наскрозь камунізмам. Ён ня мае нават пашанаваньня памёршых і дзеля свае й уласнай карысьці нарушае супакой нябошчыкаў, разьбіраючы надгробкі, а на іншых беларусаў, якія выяўляюць адкрыта нацыянальную сьведамасьць, даносіць, што гэта комуністыя.

Ганьба гэтаму маральнаму трупяку Язэпу, а разам з ім і ўсім маральным трупяком, якія стараюцца пашыраць па нашых вёсках маральную гніль.

Няхай жыве і пашыраецца сярод нас здаровая хрысьціянская мараль!

Набожны Дзед.

ЦАРКОЎНЫЯ СПРАВЫ.

Нясьвіскі пав. Большая частка насельніцтва Нясьвіскага пав. гэта праваслаўныя беларусы. У Нясьвіскім павеце ёсьць дзесятак цэркваў: у Нясьвіжы, Клецку, Лані, Сіняўцы, Грыцавічах і іншых мясцовасьцях.

Трывожаць праваслаўных беларусаў распачаты судовы працэс польскімі біскупамі аб адабраньні вялікага ліку праваслаўных сьвятыняў. Гэта апошняе вельмі непакоіць праваслаўных.

Няхай тыя прадстаўнікі ад беларусаў, якія паедуць на Сабор, памятаюць аб гэтым.

Вестка аб скліканьні праваслаўнага Сабору знайшла гарачы водгук ў сэрцах праваслаўных беларусаў Нясьвіскага пав. Паўшлі згодр прыхаджан гутаркі аб канечнасьці скліканьня Сабору, бо за 10 гадоў набралася множства рожных спраў, якія можа вырашыць толькі Сабор. Прыхаджкія сабраньні, дзеля выбараў прадстаўнікоў на Сабор былі ўсюды многалюдныя. Выбраны ўсюды беларусы.

М — к.

Нядаўна выйшла з друку і паступіла ў прадажу кніжка п. н.

„Smyk biełaruski"

Фр. Багушэвіча,

юбілейнае і папраўленае выданьне Бел. Інстытуту Г. і К. Кніжка гэта зьмяшчае вельмі прыгожыя вершы Бацькі беларускага адраджэньня, якім ёсьць Фр. Багушэвіч, кніжка **каштуе 60 гр.** Купіць можна ў ва-ўсіх беларускіх кнігарнях. Галоўны склад: кнігарня „Пагоня", Вільня, Людвісарская вул. № 1.

Лякарня Літоўскага
Т-ва
Санітарнае Помачы.
ў Вільні, Віленская вул. 28.

Прыймаюць дахтары спэцыялісты.—Адбываюцца ўсялякага роду опэрацыі. У лякарні аддзелы: **унутраны, хірургічны, гінэколёгічны і радзільны.**

Кабінэт Рэнтгэна і электра-мэдычны
Лячэньне праменьнямі, фатаграфаваньне, прасьвятляньне, электрычны масаж.

Прыймо ад гадз. 10 р. да 4 па пал.
Незаможным уступка.

Рэдактар Янка Пазьняк. Бел. Дрк. ім. Фр. Скарыны Вільня, Завальная 6—10. Выдавец Альбін Стэповіч